**Падаляначка**
Карагод-гульня

Дзе ж тут была Падаляначка,
Дзе ж тут была маладзесенька.
Тут яна ўпала,
Да зямлі прыпала.
Устань, устань, Падаляначка.
Прамый вочкі, як шкляначка,
Прычашы галоўку,
Да вазьміся ў бокі,
Да пайдзі ў скокі,
Бяжы да Дунаю,
Бяры каго ль з краю.

Дзяўчаты-ўдзельніцы абіраюць “Падаляначку”. Яна ў цэнтры кола выконвае тое, пра што спяваюць дзяўчаты, якія рухаюцца ў карагодзе па сонцу. У канцы “Падаляначка” абірае наступную, і гульня паўтараецца.

Запісаў Басаў Р.Ц. у 2006 г. у в. Гадзічава ад Зайцавай Анастасіі Нікіфараўны 1926 г.н., Лапека Варвары Агееўны, 1910 г.н., Зайцавай Марыі Іванаўны, 1921 г.н., Лаўровай Марыі Нікіфараўны, 1924 г.н., Басавай Таццяны Сяргееўны, 1934 г.н., Зайцавай Марыі Андрэеўны, 1937 г.н.